# ВОДЗЫЎ

аб аўтарэфераце дысертацыі Панова Сяргея Веніямінавіча
«Развіццё школьнай гістарычнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь»,
прадстаўленай на атрыманне вучонай ступені
доктара педагагічных навук па спецыяльнасці13.00.01 – агульная педагогіка,
гісторыя педагогікі і адукацыі

Аўтарэферат дысертацыі па свайму зместу сведчыць аб гісторыка-педагагічным характары даследавання і адпавядае заяўленай спецыяльнасці. У дысертацыйным даследаванні Панова С.В. абгрунтаваны канцэптуальныя асновы школьнай гістарычнай адукацыі як комплекснай педагагічнай сістэмы, што актуальна для мадэрнізацыі яе структуры, зместу, функцыяналу. Даследаванне, прадстаўленае праз аўтарэферат, мае характар міждысцыплнаранага, бо ў ім спалучаюцца метадалагічныя асаблівасці гісторыі адукацыі як галіны педагагічнай навукі з метадалагічнымі прынцыпамі гістарычнага пазнання як галіны гістарычнай навукі.

Актуальнасць тэмы дысертацыі відавочна ва ўмовах рэалізацыі дзяржаўнай гістарычнай палітыкі ў Рэспубліцы Беларусь і ажыццяўлення Праграмы патрыятычнага выхавання насельніцтва Рэспублікі Беларусь на 2022–2025 гг. Уяўляецца своечасовай рэалізацыя ахарактарызаванай у аўтарэфераце сацыяльна-педагагічнай мадэлі патрыятычнага выхавання вучнёўскай моладзі, распрацаванай з удзелам саіскальніка.

Як сведчыць змест аўтарэферата, у дысертацыі саіскальнікам вызначаны і абгрунтаваны канцэптуальныя асновы школьнай гістарычнай адукацыі, што з'яўляецца мэтай даследавання. Пры гэтым школьная гістарычная адукацыя разглядаецца саіскальнікам комплексна ў якасці інстытуцыянальна-ведамаснай сістэмы і як сацыягуманітарная з'ява. У дысертацыйным даследаванні школьная гістарычная адукацыя як інстытуцыянальна-ведамасная сістэма вывучаецца на I, II, III ступенях агульнай сярэдняй адукацыі. Саіскальнікам удакладнены канцэптуальна-метадалагічны, інстытуцыянальна-функцыянальны, зместава-дзейнасны, сацыяльна-аксіялагічны кампаненты школьнай гістарычнай адукацыі ў спалучэнні з адпаведнымі фактарамі, якія дэтэрмініравалі яе развіццё. Сярод такіх фактараў саіскальнікам вызначаны і ахарактырызаваны нарматыўна-прававая распрацоўка канцэптуальных асноў школьнай гістарычнай адукацыі ў трох пакаленнях канцэпцый; ажыццяўленне дзяржаўнай гістарычнай палітыкі, накіраванай на замацаванне беларускай нацыянальнай канцэпцыі гістарычнага мінулага; рэалізацыя гісторыяй Беларусі яе нацыястваральнай ролі праз канструяванне зместу адукацыі; трансляцыя зместу адукацыі як сацыяльнага вопыту ва ўмовах сучаснай міжпакаленнай камунікацыі пры забеспячэнні пераемнасці гістарычнай памяці і сістэмы традыцыйных каштоўнасцей. Мадэль вывучэння працэсу развіцця школьнай гістарычнай адукацыі, сканструяваная саіскальнікам і прадстаўленая ў аўтарэфераце, улічае вышэйзгаданыя кампаненты і фактары.

Навуковай навізной даследавання з'яўляецца плённае вывучэнне школьнай гістарычнай адукацыі як сацыягуманітарнай з'явы і сістэматызаваная саіскальнікам характарыстыка міждысцыплінарных канцэптаў гістарычнай памяці, нацыі і нацыянальнай ідэі, нацыянальна-культурнай ідэнтычнасці, беларускай дзяржаўнасці, традыцыйных каштоўнасцей сучаснага беларускага грамадства, якія тэарэтычна вызначаны прадстаўнікамі сучаснага беларускага навукова-педагагічнага супольніцтва і рэалізаваны ў змесце школьнай гістарычнай адукацыі. Вышэйзгаданыя канцэпты сталі інструментальнымі маркерамі праведзенага саіскальнікам кантэнт-аналізу школьнай вучэбнай літаратуры па гісторыі, якія варта ўлічваць у працэсе фарміравання нацыянальна-культурнай ідэнтычнасці вучняў.

Саіскальнікам упершыню ў тэорыі і практыцы школьнай гістарычнай адукацыі комплексна выяўлены яе тэндэнцыі і перспектывы развіцця. Яны тычацца змен у канцэптуальным мэтавызначэнні, прынцыпах абнаўлення зместу, цыклічнасці ў яго дыдактычным структураванні, удакладнення функцыяналу, а таксама ажыццяўлення нацыястваральнай ролі гісторыяй Беларусі, удакладнення прынцыпаў адбору зместу, інтэграцыі гісторыі Беларусі і сусветнай гісторыі.

Варта адзначыць, што абгрунтаванасць і дакладнасць вынікаў дысертацыі мае сваёй асновай дастаткова вялікую базу – 13 навукова-даследчых работ з удзелам саіскальніка, а таксама ўлічвае выкарыстанне вынікаў даследавання ў інстытутах развіцця адукацыі на курсах павышэння кваліфікацыі настаўнікаў гісторыі, што падцвярджаецца 10 актамі аб практычным выкарыстанні. Варта заўважыць, што саіскальнік з'яўляецца сааўтарам 19 вучэбных дапаможнікаў па гісторыі для розных класаў з грыфам Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, а таксама распрацоўшчыкам Канцэпцыі школьнай гістарычнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь, адобранай Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь у 2022 г.

Аўтарэферат дысертацыі Панова С. В. «Развіццё школьнай гістарычнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь» сведчыць аб тым, што аўтарскае гісторыка-педагагічнае даследаванне адпавядае навуковай кваліфікацыі доктара педагагічных навук па спецыяльнасці 13.00.01 – агульная педагогіка, гісторыя педагогікі і адукацыі.

Водзыў заслушаны і абмеркаваны на пасяджэнні кафедры агульнай і прафесійнай педагогікі ўстановы адукацыі «Рэспубліканскі інстытут прафесійнай адукацыі» (пратакол № 2 ад 3 лютага 2025 г.

Загадчык кафедры агульнай і прафесійнай педагогікі,
установы адукацыі "Рэспубліканскі інстытут
прафесійнай адукацыі, доктар педагагічных навук,
прафесар В.М. Наумчык

Подпись Наумчик В.М.
удостоверяю
Специалист ... Гоменюк